

# СПОРТ І ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## АНАЛІТЫКА ЗА

кастрычнік-сьнежань 2023

FAIRPLAY

SPORT FOR FAIR, EQUAL AND INCLUSIVE WORLD

# Зьмест


Уводная . . . 1

Што ня так з правамі чалавека ў спорце ў Беларусі? . . . 3

Правы жанчын у спорце . . . 6

ЛГБТК+ . . . 9

Расізм і антысемітызм . . . 11

Бясьпека, абарона і абслугоўваньне падчас спартовых мерапрыемстваў . . . 13

Вайна і спорт . . . 17

Права на здароўе . . . 20

Іншыя парушэньні правоў чалавека ў спорце . . . 23

Заключэньне . . . 25

# Сьпіс абрэвіятур

МАК — Міжнародны Алімпійскі камітэт
НАК — Нацыянальны Алімпійскі камітэт
УАФ — Українська асоціація футболу
AFC — Asian Football Confederation
AFF — Afghanistan Football Federation
EIHL — Elite Ice Hockey League
IFA — Israel Football Association
IIHF — International Ice Hockey Federation
MLB — Major League Baseball
FIFA — Fédération Internationale de Football Association
JFF — Jamaica Football Federation
MLS — Major League Soccer
NHL — National Hockey League
UEFA — Union of European Football Associations
USMNT — United States Men's National Team
USSF — United States Soccer Federation
USWNT — United States Women's National Team
UWCL — UEFA Women's Champions League
WSL — Women's Super League
WTA — Women's Tennis Association

# Уводная

У аналітыцы за кастрычнік-сьнежань 2023 года мы прааналізавалі найбольш значныя падзеі і навіны ў спорце праз прызму міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека.

Дэ-факта ўлады Беларусі працягваюць перасьлед нязгодных з рэжымам прадстаўні_ц спартовай індустрыі, захоўваецца практыка запісу «пакаяльных» відэа. Між тым, МАК прынялі рашэньне аб допуску да Алімпійскіх гульняў 2024 года спарто_вак зь Беларусі і Расеі ў нэўтральным статусе.

У аналізаваны перыяд мы змаглі адзначыць падзеі, якія сьведчаць аб разьвіцьці жаночага спорту, у прыватнасьці — футболу. Значнай падзеяй зьяўляюцца прыклады будаўніцтва стадыёнаў спецыяльна для жанчын — гэта важны крок для забесьпячэньня прынцыпаў інклюзіі і недыскрымінацыі.

Сутыкненьні футбольных заўзятар_ак засталося адной з ключавых праблем у кантэксьце бясьпекі і абароны падчас спартовых мерапрыемстваў у гэты перыяд. На жаль, людзі працягваюць падвяргацца небясьпецы, з пагрозай для іх здароўя і нават жыцьця. Адным з самых гучных інцыдэнтаў было сутыкненьне заўзятар_ак зборных Бразіліі і Аргентыны падчас адборачнага матчу Чэмпіянату сьвету па футболе-2026.

Права на здароўе — адно з самых вострых пытаньняў сёлета ў сьвеце спорту, і асабліва ў футболе. Перагружанасьць матчаў, высокі ўзровень траўматызму і спецыфіка траўмаў у жаночым спорце. У матэрыяле мы распавялі аб спартоў_ках, якія сутыкнуліся з траўмамі, а таксама аб існых дасьледаваньнях па гэтай тэме.

У нашым матэрыяле мы таксама разгледзелі навіны па тэмах правоў ЛГБТК+ супольнасьці, расізму і антысемітызму, вайны ХАМАС і Ізраіля, барацьбы спарто_вак і заўзятар_ак супраць карупцыі і ня толькі.

# Што ня так з правамі чалавека ў спорце ў Беларусі?

У Магілеве быў затрыманы трэнер па каратэ Rostislav Losev. У адным з Telegram-каналаў было апублікавана «пакаяльнае відэа», у якім Losev кажа, што з 2020 года пісаў гнеўныя каментары і быў зарэгістраваны ў чат-боце пляна «Перамога». «Пакаяльныя» відэа — адна з распаўсюджаных формаў ціску дэ-факта ўладаў Беларусі, якая парушае свабоду ад зьневажальнага да годнасьці звароту, свабоду выказваньня меркаваньня, права на неўмяшаньне ў асабістае жыцьцё.

У матэрыяле за папярэдні перыяд мы дзяліліся навіной аб затрыманьні ў верасьні 2023 года трэнера акадэміі ФК «Дынама-Мінск» Artur Mustyhin. 6 лістапада стала вядома, што Mustyhin атрымаў 3 гады хатняй хіміі па артыкуле 342 КК РБ. Mustyhin таксама ўнеслі ў пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненьне да экстрэмісцкай дзейнасьці.

Бацькоў і брата чэмпіёна сьвету па самба Stiapan Popov звальняюць зь віцебскай абласной СДЮШАР, дзе яны працавалі трэнерамі па дзюдо і самба, за тое, што яны не выходзілі на працу ў перыяд, калі былі арыштаваныя на 10 сутак за падпіску на рэсурсы ў Facebook, прызнаныя экстрэмісцкімі.

Затрыманы дзіцячы трэнер ХК «Лакаматыў-Орша». У перапісцы ў адным з Telegram-чатаў ён напісаў «Зяленскі — прыгожае прозвішча». Інфармацыя пра гэта зьявілася ў Telegram-канале ГУБАЗіК — выказваньне трэнера назвалі «палітычным камінг-аўтам», паведамілі, што правялі «антыэкстрэмісцкую трэніроўку», і апублікавалі чарговае «пакаяльнае» відэа. ГУБАЗіК таксама заявілі, што Федэрацыя прасочыць за тым, каб трэнера «ніколі больш не дапускалі да трэнерскай дзейнасьці».

Anastasia Mironchik-Ivanova, беларуская лёгкаатлетка і падпісантка праўладнага ліста спарто_вак, атрымала медаль Чэмпіянату сьвету 2011 года — там яна заняла 4 мейсца, аднак пазьней атлетка, якая заняла 3 мейсца, была дыскваліфікаваная за допінг. У сьнежні 2023 года Mironchik-Ivanova распавяла аб тым, як атрымлівала медаль: «Калі мне вярнуўся медаль з Чэмпіянату сьвету, ён прыйшоў са стужкай ЛГБТ. Я абрэзала гэтую стужку. Часта прыходжу да дзетак у школу, яны задаюць пытаньне, чаму медаль бяз стужкі. Я адказваю, што Беларусь — за традыцыйныя сямейныя каштоўнасьці. Так здарылася, што медаль прыйшоў са стужкай ЛГБТ, якую прыйшлося выдаліць». Прасоўваньне гетэранарматыўных каштоўнасьцей з боку дэ-факта ўладаў Беларусі стварае абстаноўку, у якой прадстаўні_цы ЛГБТК+ супольнасьці могуць баяцца адкрыта выказваць сваю ідэнтычнасьць, што супярэчыць прынцыпам роўнасьці і недыскрымінацыі.

Спартовае медыя Tribuna.com былі абвешчаныя «экстрэмісцкім фармаваньнем», а Instagram-акаўнт спартовага журналіста Aliaksandr

Ivulin быў прызнаны «экстрэмісцкімі матэрыяламі». Абмежаваньне свабоды СМІ і прылічэньне незалежных СМІ да «экстрэмісцкіх» зьяўляецца адным з асноўных рычагоў ціску дэ-факта ўладаў Беларусі. Гэтыя дзеяньні падрываюць асноўныя прынцыпы свабоды выказваньня меркаваньняў і свабоды прэсы, якія зьяўляюцца найважнейшымі складнікамі дэмакратычнага грамадства.

МАК прынялі рашэньне аб допуску да Алімпійскіх Гульняў 2024 года ў Парыжы спарто_вак зь Беларусі і Расеі. Удзельнічаць у спаборніцтвах атлет_кі змогуць у нэўтральным статусе. На дадзены момант 8 расейскіх і 3 беларускіх спарто_вак прайшлі кваліфікацыю. Рэакцыя на гэтую навіну была неадназначнай — яе раскрытыкавалі некаторыя ўкраінскія прадстаўні_цы спартовай індустрыі; былы міністр спорту Расеі назваў такія ўмовы ўдзелу ў спаборніцтвах «зьневажальнымі», а прынятае МАК рашэньне — «падачкай». У НАК Беларусі ўмовы допуску назвалі «дыскрымінацыйнымі» і «якія не задавальняюць інтарэсы беларускай спартовай супольнасьці ў поўнай меры».

Рашэньне МАК падтрымаў Thomas Bach, прэзідэнт МАК; ён заявіў, што «індывідуальных атлет_ак нельга караць за дзеяньні іх урадаў», а таксама выказаўся пра вайну ва Украіне: «Адна вайна з 28 войнаў і канфліктаў, якія зараз ідуць у сьвеце, і ўсе іншыя атлет_кі мірна спаборнічаюць ад_на з адн_ой».

Беларуская лёгкаатлетка Yana Maksimava заявіла, што не згодная з тым фактам, што беларускіх атлет_ак, нават тых, хто супраць вайны, «прыраўнялі да расейскіх», і яны ня могуць удзельнічаць у АГ ў якасьці свабодных спарто_вак.

У сваёй заяве МАК зноў указалі, што спартоў_кі, якія падтрымліваюць вайну і/ці заключылі кантракт зь беларускімі ці расейскімі вайскоўцамі ці органамі нацыянальнай бясьпекі, ня змогуць удзельнічаць у АГ. Аднак пацьвердзілася дачыненьне да беларускіх вайскоўцаў атлеткі Vanessa Kaladzinskaya, якая ўжо кваліфікавалася на АГ.

У сьнежні прайшоў дабрачынны збор у падтрымку беларускага гросмайстра, вольнага спартоўца, Uladzislau Kovaleu, для пакрыцьця выдаткаў, зьвязаных з падрыхтоўкай і ўдзелам у Чэмпіянаце сьвету. Неабходная сума была сабрана ўсяго за некалькі дзён, што зьяўляецца чарговым прыкладам салідарнасьці беларускага грамадства. У Міжнародны дзень правоў чалавека, 10 сьнежня, у Цюрыху адбыўся забег у падтрымку беларускіх палітвя_зынак, арганізаваны праваабарончай арганізацыяй Libereco. Падчас мерапрыемства кожн_ая бягун_ка удзельнічала ад імя адн_ой палітвя_зынкі — такім чынам, арганізатар_кі плянавалі забясьпечыць збор данатаў для кожна_й з іх. На момант публікацыі ў Беларусі палітвя_зынкамі прызнаны 1415 чалавек.

# Правы жанчын у спорце

Kim Ng стала першай жанчынай-кіраўніком MLB, якая выйшла ў плэй-оф. Allysa Nakken — першая жанчына, якая прайшла сумоўе на пасаду мэнэджаркі ў MLB. Union Berlin увайшоў у гісторыю Bundesliga, прызначыўшы жанчыну, Marie-Louise Eta, асістэнткай трэнера. Rebecca Welch стала першай жанчынай, якая судзіла матч Прэм'ер-Лігі. Laila Edwards — першая цёмнаскурая жанчына ў зборнай ЗША па хакеі. Гэта чарговая падборка навін аб «першых» дасягненьнях жанчын у спартовай індустрыі. Такія навіны, безумоўна, зьяўляюцца прыкладамі посьпеху і развіцьця, але таксама гэта сьведчыць і аб неабходнасьці сістэматычных зьмен з мэтай пераадоленьня гендэрнай няроўнасьці.

Carson Pickett стала першай футбалісткай з інваліднасьцю ў серыі FC 24. Гульня Pickett на вышэйшым футбольным узроўне зьяўляецца пацьвярджэньнем таго, што інваліднасьць не павінна быць перашкодай для заняткаў спортам, а з уключэньнем футбалісткі ў папулярны сімулятар яе гісторыя можа працягваць натхняць іншых у глабальным маштабе.

Emma Hayes стала самай высокааплатнай трэнеркай у жаночым футболе — 1,6 млн. даляраў у год. Hayes падпісала кантракт з USWNT. Яе кантракт «зраўняецца з зарплатай» цяперашняга галоўнага трэнера USMNT. Гэта сапраўды знакавы момант для футбола і ўсіх жанчын-трэнерак, бо дэманструе роўнасьць на практыцы. USSF сёлета робяць шмат для забеспячэньня гендэрнай роўнасьці — у нашым матэрыяле за папярэдні перыяд вы можаце даведацца пра гістарычнае пагадненьне паміж мужчынскай і жаночай зборнымі ЗША.

На матчы Arsenal FC-Chelsea FC быў усталяваны новы рэкорд наведвальнасьці WSL — амаль 60 000 заўзятар_ак. У той жа час Arsenal гэтак жа, як і Juventus, Wolfsburg і Manchester United, не змаглі прайсьці ў групавы этап UWCL у гэтым сезоне, што выклікала расчараваньне саміх клюбаў і заўзятар_ак. У сваю чаргу, UEFA абвясьцілі аб намеры правядзеньня зьмен у жаночай гульні — у наступным сезоне будзе павялічана колькасьць каманд, якія змогуць удзельнічаць у турніры, сам турнір пройдзе ў фармаце табліцы; UEFA таксама запусьцяць другі жаночы эўрапейскі турнір, хутчэй за ўсё, падобна Лізе Эўропы. Гэтыя рашэньні зьяўляюцца лягічным адказам на цікавасьць да жаночага футбола, якая расьце ва ўсім сьвеце.

Kansas City Current пабудавалі першы ў сьвеце стадыён і вучэбна-трэніровачны комплекс спецыяльна для жаночае прафэсійнае спартовае каманды. Адкрыцьцё стадыёна заплянавана на 2024 год, яго ўмяшчальнасьць — 11 500 чалавек. Трэніровачны комплекс быў пабудаваны Monarch Build — будаўнічай фірмай, якая належыць жанчынам. Такім чынам, каманда KC Current прадэманстравала рэальнае імкненьне ўсталяваць стандарты для будучага жаночага спорту.

Brighton таксама атрымалі дазвол на будаўніцтва стадыёна спецыяльна для жанчын. Той факт, што жанчынам даводзіцца дзяліць футбольнае поле з мужчынамі і звычайна прыярытэт аддаюць гульням мужчынскіх каманд, — зьяўляецца распаўсюджанай праблемай. Brighton могуць стаць добрым прыкладам для іншых клюбаў ня толькі ў Ангеліі, але і ва ўсім сьвеце. Пакуль няма дакладнай інфармацыі аб тым, якой менавіта будзе інфраструктура стадыёна, і ці будуць прынцыповыя адрозненьні ад «мужчынскіх» стадыёнаў. Член Рады Brighton Hove City John Hewwit лічыць: «Адна з прычын, па якой неабходна мець спецыяльна пабудаваны стадыён, — гэта розныя патрэбы. Напрыклад, пры гульні на мужчынскім стадыёне ў распранальнях можа быць усяго дзьве кабінкі, у той час як на спецыяльна пабудаваным жаночым стадыёне іх будзе больш».

На працягу некалькіх месяцаў зборная каманда Ямайкі Reggae Girlz змагаецца за свае правы і справядлівыя ўмовы працы. Яшчэ ў чэрвені гул_іні апублікавалі адкрыты ліст у адрас JFF, у якім выказалі незадаволенасьць трэніровачнай базай, умовамі пражываньня і транспарта, кампенсацыяй пры арганізацыі збораў, камунікацыяй з JFF. У матэрыяле за папярэдні перыяд мы дзяліліся навіной аб неверагодным выніку, якога дасягнула зборная Ямайкі на ЧС-2023 — 1/8 фіналу. У новай заяве, апублікаванай Reggae Girlz, футбалісткі заяўляюць, што да гэтага часу не атрымалі паўнавартасную выплату пасьля ўдзелу ў ЧС; папярэднія патрабаваньні таксама засталіся ў сіле. У сувязі з неналежным і непаважлівым стаўленьнем з боку JFF гул_іні прынялі рашэньне аб байкоце міжнароднага акна ў кастрычніку 2023 года, якое ўключае ў сябе адборачны матч Залатога кубка.

Жаночы футбол становіцца ўсё больш папулярным, што цягне за сабой зьмены ўмоваў унутры гульні. На гэты момант мы ўжо можам назіраць пазітыўныя зьмены, аднак такія сітуацыі сьведчаць аб неабходнасьці працягваць працу на ўсіх узроўнях з мэтай забеспячэньня справядлівых і бясьпечных умоваў працы спартовак.

WTA таксама сутыкнуліся з пратэстам многіх вядучых гулінь наконт аплаты і ўмоваў працы ў жаночым тэнісе. Гуліні падпісалі калектыўны ліст са сьпісам патрабаваньняў, у ліку якіх гарантаваная аплата ў адпаведнасьці з рэйтынгам гуліні, кампенсацыі ў выпадках траўмы або перапынку ў перыяд цяжарнасьці, а таксама афіцыйнае прадстаўніцтва PTPA у Радзе WTA. Пісьмовага адказу тэнісісткі не атрымалі, але былі запрошаныя на дзьве сустрэчы з кіраўніцтвам WTA, вынікамі якіх гуліні засталіся незадаволеныя. Аднак, па выніках 2023 года ўпершыню ў гісторыі больш за 100 гулінь WTA зарабілі больш за 500 тыс. даляраў.

## ЛГБТК+

Пасьля ўвядзеньня забароны на вясёлкавыя джэрсі, паколькі у гэтым занадта шмат «адцягваючых фактараў», у пачатку кастрычніка NHL забаранілі гульцам выкарыстоўваць і вясёлкавыя стужкі для клюшак.
Але ўжо 21 кастрычніка ў гульні з Anaheim Ducks абаронца Arizona Coyotes Travis Dermott абматаў клюшку раней забароненай стужкай.
А 24 кастрычніка NHL зрабілі афіцыйную заяву, у якой адмянілі ўведзеную раней забарону на абмотваньне клюшак вясёлкавымі стужкамі.

У матэрыяле за папярэдні перыяд мы дзяліліся навіной аб тым, што World Aquatics сталі першай міжнароднай федэрацыяй, якія стварылі адмысловую адкрытую спаборніцкую катэгорыю для трансгендэрных спарто_вак. Аднак гэтая катэгорыя на Кубку сьвету, які прайшоў у кастрычніку, была адменена з-за адсутнасьці заявак. У World Aquatics заявілі, што паспрабуюць зноў рэалізаваць сваю ініцыятыву.

Беларуская баскетбалістка Katherina Snytsina зрабіла камінг-аўт падчас аднаго з інтэрнет-шоу. А ў інтэрвію для «Люстэрка» спартоўка падзялілася сваімі думкамі аб тым, чаму не было жаданьня і магчымасьці быць адкрытай, знаходзячыся ў Беларусі. Snytsina адзначыла, што за 3 дні пасьля камінг-аўту не атрымала ніводнага негатыўнага каментара, а толькі словы падтрымкі і падзякі. На пытаньне, ці адчувае яна, што зрабіла нешта важнае для Беларусі, баскетбалістка адказала: «Не ўсведамляла маштаб, але, паўтаруся, атрымала вялікую колькасьць удзячных паведамленьняў, што публічны чалавек так адкрыта, шчыра, спакойна і ненадакучліва расказвае і паказвае сваё шчасьце і арыентацыю». І сапраўды, сярод публічных людзей, у прыватнасьці, у сьвеце беларускага спорту, такіх прэцэдэнтаў раней не было.

Трансгендэрная футбалістка з Rossington Main Ladies прыняла рашэньне аб сыходзе з каманды і з жаночага футбола ў цэлым, бо суперніцы байкатавалі матчы з удзелам спартоўкі. На дадзены момант у Football Association існуе палітыка ў дачыненьні да трансгендэрных спарто_вак, але яе сутнасьць заключаецца ў тым, што «гендэрная ідэнтычнасьць не павінна быць перашкодай для ўдзелу ў футболе», аднак, на практыцы рашэньні прымаюцца непасрэдна ў кожным асобным выпадку. Асноўны крытэр для гул_інь, якія старэйшыя за 18 год – узровень тэстастэрону. Аднак, гэта дыскрымінацыйны падыход, які не ўлічвае мноства іншых фактараў, якія ўплываюць на дэманстраваны вынік спарто_вак. У FA заявілі, што зараз яны «пераглядаюць сваю трансгендэрную палітыку ў ангельскім футболе, каб забясьпечыць яе інклюзіўнасьць, справядлівасьць і бясьпеку для ўсіх».

# Расізм і антысемітызм

Arsenal FC апублікавалі фота жаночае каманды сезона 2023/24, у склад якой уваходзяць толькі светласкурыя гуліні. Пасьля публікацыі фота клюб сутыкнуўся з крытыкай у сувязі з адсутнасьцю разнастайнасьці. У клюбе прызналі праблему і запэўнілі, што прыкладаюць намаганьні з мэтай зьмены сітуацыі: «Прыярытэтнай задачай клюба зьяўляецца далейшае забесьпячэньне большай разнастайнасьці і інклюзіўнасьці, а таксама стварэньне пачуцьця прыналежнасьці для ўсіх, хто зьвязаны з клюбам».

Адсутнасьць разнастайнасьці зьяўляецца сур'ёзнай праблемай у эўрапейскім жаночым футболе. Па гэтай прычыне Versus і Spotify выпусцілі фільм “The Equaliser”, які даследуе расавую няроўнасьць у жаночым футболе. У даследаваньні прынялі ўдзел тры прафэсійныя гуліні. Яны ўжо ўдзельнічалі ў праэкце Spotify і She Plays Football, накіраваным на павелічэньне разнастайнасьці нізавых каманд і прадастаўленьня ўнікальных магчымасьцяў для дзяўчынак, якія імкнуцца гуляць у футбол, пра які мы расказвалі ў матэрыяле за красавік-чэрвень 2023 года. У фільме гуліні дзеляцца сваім досьведам і вынятымі ўрокамі, кажуць аб неабходнасьці ўключэньня светласкурых гулінь і фанат_ак у стварэньне інклюзіўнага асяродьдзя.

Sam Allison стаў першым цёмнаскурым судзьдзёй на матчы Прэм'ер-лігі за апошнія 15 гадоў і толькі другім за ўсю гісторыю. Першым быў Uriah Rennie, апошнюю сваю гульню ён правёў у 38-м туры сезона 2007/2008.

Wilfried Nancy стаў першым цёмнаскурым трэнерам, які выйграў Кубак MLS. Як мы бачым, праблемы з этнічнай разнастайнасьцю ў футболе ёсьць на і за межамі поля, ня толькі ў Ангеліі ці Амерыцы, але і ва ўсім сьвеце. Па стане на сезон 2023/2024 у гісторыі Прэм'ер-лігі было ўсяго 11 цемнаскурых мэнэджар_ак, а па дадзеных Black Footballers Partnership толькі 4,4% кіраўнічых пасад у ангельскім футболе займаюць цёмнаскурыя людзі, пры тым што паказчык цёмнаскурых футбаліст_ак у Прэм'ер-лізе — 43 %.

Прыклады Sam Allison і Wilfried Nancy могуць натхніць новыя пакаленьні гул_інь, трэнер_ак і заўзятар_ак і дапамагчы паверыць у рэальнасьць пазітыўных зьмен.

“Blue is The Color” — дакумэнтальны фільм пра тое, як гэта — быць цёмнаскурай фанат_кай Chelsea FC. Праэкт быў рэалізаваны ў рамках ініцыятывы Blue Creator Fund, мэта якой — даць магчымасьць маладым людзям з малапрадстаўленых пластоў грамадства стварыць творчы праэкт аб Chelsea і яго супольнасьці. Пераможцаў было двое, другім стаў пачынаючы ювелірны дызайнер, які стварыў капсульную калекцыю кольцаў-друкаў “Chelsea”. Ініцыятыва зьяўляецца прыкладам існуючага патэнцыялу для зьмены культуры ў футболе, падтрымліваючы новыя пакаленьні людзей, для якіх футбол — не проста гульня.

## Бясьпека, абарона і абслугоўваньне падчас спартовых мерапрыемстваў

Матч зборных Бельгіі і Швецыі спынілі па просьбе і згодзе дзьвух каманд у перапынку пасьля навіны аб тым, што ўзброены мужчына застрэліў дзьвух заўзятараў Швецыі перад пачаткам матча ў Брусэлі. Заўзятар_кі былі змушаныя застацца на стадыёне на працягу 2,5 гадзін, перш чым пачалася эвакуацыя. Пры спробе арышту паліцыя застрэліла падазраванага. Пасьля перапынку лік гульні быў 1:1. UEFA прынялі рашэньне прызнаць матч спыненым, а вынік 1:1 аб'явілі канчатковым.

Матч 10 тура Чэмпіянату Францыі па футболе паміж Olympique de Marseille і Olympique Lyonnais быў сарваны з-за атакі фанат_ак Marseille на аўтобус з футбалістамі і прадстаўні_цамі трэнерскага штаба Lyon. Вокны з правага боку аўтобуса ўзарваліся. Fabio Grosso і трэнер клюба атрымалі сур'ёзныя траўмы твару.

Два заўзятара Celtic FC атрымалі нажавыя раненьні з боку ультрас S.S. Lazio перад матчам у адным з пабаў у Рыме. Гэтаму інцыдэнту папярэднічала некалькі эпізодаў канфлікту паміж Celtic і Lazio: перад матчам на Celtic Park фанат_кі Lazio прайшлі маршам па Глазга ў фашысцкім прывітаньні, у адказ фанат_кі Celtic выкарыстоўвалі банэр з выявай перавернутага ўверх нагамі Benito Mussolini з надпісам “Follow Your Leader” («ідзі за сваім лідэрам»). UEFA аштрафавалі Celtic FC за гэты банэр і «забароненыя сьпевы» і S.S. Lazio — за «забароненыя сьпевы».

У Грэцыі спынілі матч паміж FC Panathinaikos і FC Olympiakos у пачатку другога тайма з-за таго, што побач з гульцом Panathinaikos Juan Carlos разарвалася петарда. Гэты інцыдэнт зьяўляецца чарговым доказам высокага ўзроўню гвалту ў грэчаскім футболе і адсутнасьці адэкватнага мэханізму супрацьдзеяньня яму.

Важнай акалічнасьцю, якая характарызуе кантэкст дадзенага матча, зьяўляецца той факт, што першапачаткова арбітр не жадаў спыняць гульню пасьля разрыву петарды; справа ў тым, што эўрапейскія арбітры, якія ўваходзяць у элітную катэгорыю і катэгорыю А судзьдзяў UEFA, не працуюць на матчах Чэмпіянату Грэцыі. Такое рашэньне прынята ў адказ на акцыі ў дачыненьні да паляка Pavel Pacovský і італьянца Davide Massa, якія абслугоўвалі матч A.E.K і Aris. Такім чынам, скандалы ў грэчаскім футболе, якія цягнуць за сабой зніжэньне ўзроўню судзейства, могуць прывесьці да трагічных наступстваў, якія ўплываюць на жыцьцё і здароўе ўдзельні_ц футбольных матчаў. Як вынік — футбольныя клюбы вышэйшага дывізіёна Грэцыі павінны праводзіць усе свае матчы без заўзятар_ак на працягу дзьвух месяцаў.

Пасля матчу SSC Napoli-AC Milan у 10 туры Серыі А цела 42-гадовага мужчыны было знойдзена ноччу на падземнай паркоўцы стадыёна Diego Armando Maradona. Труп быў знойдзены пад гасьцявым сектарам стадыёна. Паводле паліцэйскае рэканструкцыі падзеяў, два чалавекі без

квіткоў спрабавалі патрапіць на трыбуны праз тунэль; загінулы мужчына спрабаваў узлезці на трыбуну, але ўпаў на зямлю з вышыні каля 20 метраў.

Прэзідэнт турэцкага клюба MKE Ankaragucu Faruk Koca ударыў у твар судзьдзю матчу з Caykur Rizespor, які скончыўся з лікам 1:1, дзякуючы галу, забітаму ў дададзены час. Коса быў арыштаваны, пазьней ён падаў у адстаўку. Прэзідэнт Турцыі Recep Tayyip Erdoğan выказаўся з асуджэньнем і заявіў, што «спорт несумяшчальны з гвалтам». У Турцыі на нявызначаны тэрмін прыпынілі ўсе ўнутраныя футбольныя матчы.

Жорсткае сутыкненьне адбылося паміж заўзятар_камі Бразіліі і Аргентыны падчас адборачнага матчу Чэмпіянату сьвету-2026 па футболе. Падчас выкананьня гімнаў на адной з трыбун разьвязалася бойка; у бойку ўмяшалася паліцыя, зьбіваючы заўзятар_ак дубінкамі; заўзятар_кі ў адказ кідалі ў паліцэйскіх крэслы, іншыя ў паніцы пакідалі трыбуны, выходзячы на поле, каб пазьбегнуць бойкі. Зборная Аргентыны пакінулі поле ў мэтах бясьпекі, у тым ліку саміх заўзятар_ак. Матч пачаўся амаль праз 30 хвілін. Прэзідэнт FIFA Gianni Infantino заявіў: «Усе без выключэньня — гульцы, заўзятар_кі, пэрсанал і мэнэджар_кі — павінны быць у бясьпецы і абаронены, каб гуляць і атрымліваць асалоду футболам, і я заклікаю кампетэнтныя органы забясьпечыць выкананьне гэтага патрабаваньня на ўсіх узроўнях».

Апісаныя інцыдэнты, у якіх у розным ступені пацярпелі прадстаўні_цы розных груп спартовай супольнасьці, зноў кажуць аб вострай неабходнасьці калектыўных высілкаў дзеля пераадоленьня варожасьці, дыскрымінацыі і гвалту ў футболе, забеспячэньня бясьпечнай і інклюзіўнай прасторы для кожн_ай.

Хакеіст Adam Johnson памёр падчас матчу EIHL у кастрычніку гэтага года ў выніку «няшчаснага выпадку»: гулец з каманды-суперніка ў момант сутыкненьня расьсёк яму горла каньком. Гэтая трагічная падзея пацягнула за сабой шматлікія дэбаты аб неабходнасьці выкарыстаньня гул_інямі візараў — ахоўных шчыткоў для шыі і твару, і ахоўнай экіпіроўкі ўвогуле.

Нашэньне шчыткоў для шыі раней не зьяўлялася абавязковым, таксама як і абарона для запясьцяў і задняй часткі ног — частак цела, найбольш уразлівых да парэзаў. Аднак, у пачатку сьнежня IIHF абвясьцілі, што ахоўныя шчыткі для шыі стануць абавязковымі для спаборніцтваў пад іхняй эгідай. Гэты мандат ня будзе распаўсюджвацца на прафэсійныя хакейныя лігі, у тым ліку NHL. USA Hockey «працягвае рэкамендаваць» выкарыстаньне шыйных шчыткоў, устойлівых да парэзаў шкарпэтак, рукавоў і бялізны. EIHL ня будуць рабіць абавязковым выкарыстаньне шчыткоў для шыі, але будуць «настойліва рэкамендаваць» насіць іх.

Сярод прычын, па якіх хакеіст_кі не выкарыстоўваюць візары

добраахвотна называюць нязручнасьць, адсутнасьць абавязковасьціі нават «дурны выгляд». Спартовы журналіст The Seattle Times лічыць, што «эвалюцыі ў галіне бясьпекі звычайна спачатку патрабуюць сьмерці або сур'ёзнай траўмы». Ні адна прычына адмовы ад нашэньня абароны ня варта здароўя і жыцьця спартоў_кі, таму важна працягваць казаць аб гэтым, спрыяць забеспячэньню бясьпекі, на ўсіх узроўнях, не чакаючы яшчэ адной трагедыі.

# Вайна і спорт

5 кастрычніка 2023 года НАК Расеі ў аднабаковым парадку прынялі рашэньне аб уключэньні ў яго склад рэгіянальных спартовых арганізацый, якія знаходзяцца ў распараджэньні НАК Украіны (Данецкай, Луганскай, Херсонскай, Запарожскай). Такое рашэньне ўяўляе сабой парушэньне Алімпійскай хартыі (АХ), паколькі парушае тэрытарыяльную цэласнасьць Украіны. У выніку чаго Выканаўчая рада МАК прынялі рашэньне аб прыпыненьні працы НАК Расеі. На практыцы гэта азначае, што НАК Расеі больш ня можа дзейнічаць у якасьці НАК па вызначэньні АХ, а таксама атрымліваць фінансаваньне з боку Алімпійскага руху. МАК пакідаюць за сабой права прыняцьця рашэньня аб удзеле нэўтральных спарто_вак ад Расеі на летніх і зімовых АГ (2024 і 2026 года).

FIFA прынялі рашэньне аб зьняцьці абмежаваньняў на ўдзел у спаборніцтвах зборных Расеі U-17. Цяпер каманды змогуць прымаць удзел у спаборніцтвах у нэўтральным статусе — без нацыянальных гімна, сьцяга, экіпіроўкі. Падобнае рашэньне было прынята раней UEFA — «дзяцей ня варта караць за дзеяньні, адказнасьць за якія ляжыць выключна на дарослых». УАФ асудзілі такое рашэньне і заклікалі да яго перагляду. Акрамя таго, Данія, Ангелія, Фінляндыя, Ірландыя, Латвія, Летува, Нарвегія і Польшча далучыліся да байкоту матчаў супраць Расеі.

7 кастрычніка вайна паміж ХАМАС і Ізраілем пачалася са ўварваньня ХАМАС з сектару Газы. На дадзены момант канфлікт знаходзіцца ў актыўнай фазе, тысячы чалавек забіты, паранены ці знаходзяцца ў палоне. Падзеі, якія адбываюцца, аказваюць свой уплыў і на сфэру спорту.

Anwar El Ghazi, нападаючы нямецкага клюба Mainz, выказаўся ў падтрымку Палестыны ў сваім Instagram, з-за чаго быў адхілены ад трэніровак, аднак пасьля таго, як ён, па заяве клюба, «праявіў раскаяньне», яму дазволілі вярнуцца. Пазьней футбаліст апублікаваў новую заяву, у якой сказаў, што не адмаўляецца ад сваіх словаў. «Я супраць вайны і гвалту. Я супраць забойства ўсіх нявінных мірных жыхароў. Я супраць усіх формаў дыскрымінацыі. Я супраць ісламафобіі. Я супраць антысемітызму. Я супраць генацыду. Я супраць апартэіду. Я супраць акупацыі. Я супраць прыгнёту». Пракуратура Кобленца пачала расследаваньне ў дачыненьні да El Ghazi па падазрэньні ў «парушэньні грамадскага парадку шляхам ухваленьня злачынстваў у спалучэньні з распальваньнем нянавісьці шляхам распаўсюджваньня кантэнту». Як следства, Mainz скасаваў кантракт з футбалістам.

Кампанія PUMA абвясьціла аб спыненьні супрацоўніцтва з IFA — Асацыяцыяй футбола Ізраіля — пасьля заканчэньня тэрміну дзеяньня бягучага кантракту ў 2024 годзе. Брэнд сутыкнуўся з байкотамі і грамадскімі пратэстамі ў сувязі са спонсарствам. Палестынскія абшчыны заклікалі да байкоту праз рух "Boycott, Divest, Sanctions" («Байкот, адмова

адмова ад паслуг, санкцыі», BDS), які адыграў сваю ролю ў прыняцьці рашэньня Adidas аб разрыве супрацоўніцтва з IFA у 2018 годзе.

## Права на здароўе

Гран-Пры Formula-1, якое праводзіцца ў кастрычніку 2023 года, у Катары паслужыла падставай для таго, каб удзельнікі спаборніцтваў палічылі гонку «знойдзенай мяжой» у індустрыі. З-за сьпякоты і неабходнасьці захаваньня межаў трасы спартоўцы сутыкнуліся з каласальнай рызыкай здароўю, якая прывяла да таго, што:

- Esteban Ocon вырвала ў шлем пасьля 15-га круга Гран-Пры;
- Alexander Albon з "Williams" ня змог сам вылезці з какпіта пасьля фінішу — яму спатрэбілася дапамога. Каманда пацьвердзіла: гоншчыка даставілі ў медцэнтр, дзе яму дыягнаставалі моцны цеплавы ўдар;
- Lance Stroll з Aston Martin адразу пасьля канчатка гонкі накіраваўся да карэты хуткай дапамогі;
- Пілоты адкрывалі візары на хуткасьці больш за 300 км/г, што магло прывесьці да атрыманьня траўмы.

Адкрытым застаецца пытаньне аб тым, якім чынам арганізатар_кі спаборніцтваў змогуць зьменьшыць негатыўнае ўздзеяньне асяродьдзя на здароўе спартоўцаў, улічваючы той факт, што Гран-Пры Катара падпісаны ў F-1 на бліжэйшыя 10 год. Ідэя павелічэньня папулярнасьці/прыбытку канкрэтнага віду спорту за кошт пашырэньня геаграфіі правядзеньня спаборніцтваў не павінна ісьці ў процівагу забеспячэньня рэалізацыі права чалавека на здароўе.

Даследаваньне, у якім вывучылі ступень уплыву перагружанасьці матчаў на здароўе футбалістаў, паказала, што правядзеньне ЧС у Катары ў сярэдзіне сезона 2022-2023, зімой, прывяло да павелічэньня колькасьці траўмаў, перыяду аднаўленьня і фінансавых затрат у сувязі з гэтым. Згодна з даследаваньнем, у сезоне 2022-2023 у пяці вядучых лігах Эўропы было атрымана 3985 траўмаў, найбольш цяжкімі з якіх былі траўмы лодыжкі, ікры/галёнкі і падкаленнага сухажыльля.

Гулец FC Barcelona Pablo Gavira атрымаў разрыў пярэдняе крыжападобнае зьвязка (ПКЗ) і спадарожнае пашкоджаньне меніска падчас адборачнага матча Эўра-2024. На дадзены момант футбаліста чакае апэрацыя і працяглы перыяд рэабілітацыі (у сярэднім, аднаўленьне пасьля траўмы ПКЗ займае ад 6 да 9 месяцаў).

Праблема высокага траўматызму ў спорце востра стаіць і ў жаночым футболе на працягу гэтага года.

Марі Leon, цэнтральная абаронца FC Barcelona, атрымала разрыў меніска падчас трэніроўкі. Ёй таксама трэба апэрацыя. Leon была адной з 15 гулінь, якія абвясьцілі забастоўку ў верасьні 2022 года, выказаўшыся аб тым, як эмацыйная абстаноўка ў зборнай Гішпаніі адбіваецца на іх здароўе. Футбалістка адмовілася ад удзелу ў складзе зборнай, нават перад ЧС-2023: «Я не магу вярнуцца, калі сітуацыя не зьменіцца».

Arsenal FC апублікавалі дакумэнтальны серыял аб аднаўленьні Beth Mead і Vivianne Miedema пасьля траўмы ПКЗ пад назвай “Step by Step”. Серыял — ня толькі спосаб распавесьці аб тым, як праходзіць аднаўленьне, але і важная заява ў асьпекце прадухіленьня траўмаў ПКЗ у жаночым футболе. Серыял зьмяшчае кадры з асабістых архіваў Mead і Miedema, што дае больш глыбокае ўяўленьне аб тым, з чым даводзілася сутыкацца спартоўкам.

З траўмамі ПКЗ спартоў_кі сутыкаюцца ня толькі ў футболе. Форвардка LSU (баскетбол) Sa'Myah Smith выбыла з гульні да канца сезона 2023-2024 пасьля разрыву ПКЗ, медыяльнае калатэральнае зьвязка (МКЗ) і меніска. Абаронца UConn Azzi Fudd таксама прапусьціць рэшту сезона 2023-2024 пасьля разрыву ПКЗ і МКЗ у правым калене падчас трэніроўкі.

Той факт, што спартоў_кі на дадзеным этапе знаходзяцца ў жорсткіх трэніровачных і спаборніцкіх раскладах, калі не застаецца дастатковага часу для аднаўленьня, безумоўна ўплывае на павышэньне ўзроўню траўматызму. Спецыфіка траўм у жаночым спорце вывучана недастаткова, што павышае рызыку непасрэдна для спартовак, і патрабуе распрацоўкі спецыяльных стратэгій прафілактыкі. Права спарто_вак на здароўе павінна быць у прыярытэце спартовых арганізацый і ўрадаў.

Клопат аб мэнтальным здароўі таксама застаецца ў цэнтры ўвагі спартовай супольнасьці.

Lyle Foster, гулец Burnley FC, узяў паўзу ў футболе з-за праблем з мэнтальным здароўем. Burnley падтрымалі рашэньне гульца і імкнуцца нармалізаваць размовы аб мэнтальным здароўі ў футболе. Клюб апублікаваў афіцыйную заяву ад імя Foster і яго сям'і, паведаміўшы, што футбаліст знаходзіцца пад назіраннем спецыяліст_ак, у клюбе імкнуцца рабіць усё неабходнае і папрасілі аб разуменьні і павазе. Гэтая праблема патрабуе вялікіх комплексных намаганьняў — неабходна, каб да пытаньняў мэнтальнага здароўя ставіліся нароўні з фізічным, каб мэнтальнае здароўе футбаліст_ак перастала быць стыгмай.

# Іншыя парушэньні правоў чалавека ў спорце

Нападаючы Jürgen Lokadia (Нідэрлянды) перайшоў у іранскі Persepolis FC у 2022 годзе. Пасьля пачатку пратэстаў у Іране восеньню 2022 года (у сувязі з гібельлю Mahsa Amini пасьля затрыманьня «паліцыяй нораваў») МЗС Нідэрляндаў раілі сваім грамадзян_кам пакінуць Іран у мэтах бясьпекі. Lokadia пакінуў Іран і скасаваў кантракт з Persepolis FC у сьнежні 2022 года. Аднак клюб быў ня згодны з такой версіяй здарэньня. Як вынік — у 2023 годзе футбаліст прайграў суд у FIFA і зараз павінен выплачваць кампэнсацыю Persepolis FC. Рашэньне па гэтай справе яшчэ не апублікавана — мы абавязкова напішам пра гэта ў будучых матэрыялах.

У канцы кастрычніка бацькі Luis Diaz, футбаліста Liverpool FC, былі выкрадзеныя паўстанцамі ў Калумбіі. Маці футбаліста была знойдзена, а бацька лічыўся зьніклым. Падчас матчу з Luton Town Diaz забіў гол, падчас сьвяткаваньня якога ён паказаў сваю футболку з надпісам “Libertad Para Papa” («свабода для таты»). Пасьля гэтага футбаліст апублікаваў пост ў Instagram з просьбай да ELN вызваліць бацьку. Liverpool FC падтрымалі гульца, апублікаваўшы афіцыйную заяву. Бацька быў вызвалены 9 лістапада. Пазней, бацькі Diaz прысутнічалі на кваліфікацыйным матчы ЧС Калумбія-Бразілія, дзе Luis Diaz забіў 2 галы, і каманда атрымала перамогу з лікам 2:1.

Мужчынская футбольная зборная Эрытрэі ня будзе прымаць удзел у адборачных матчах ЧС-2026 — паводле некаторых крыніц, улады краіны асьцерагаюцца, што гульцы паспрабуюць прасіць палітычнага прытулку ў краінах, якія будуць прымаць гасьцявыя матчы, аднак афіцыйнага тлумачэньня прынятага рашэньня з боку федэрацыі не было. У Эрытрэі на дадзены момант дзейнічае рэпрэсіўны рэжым, які лічыцца адным з найгоршых у сьвеце: абавязковая ваенная служба з заклікам на нявызначаны тэрмін, абмежаваньне свабоды СМІ, арышты за «іншадумства», катаваньні і іншыя парушэньні правоў чалавека. Гул_іні мужчынскіх і жаночых зборных Эрытрэі па футболе ўжо прасілі прытулак у перыяд удзелу ў гасьцявых матчах у мінулым.

18 футбалістаў зборнай Афганістана байкатавалі адборачны матч ЧС супраць Катара ў знак пратэсту супраць «няякаснага абыходжаньня» з боку AFF, паказваючы на праблему карупцыі. Таксама ліст, падпісаны трыма гульцамі, быў адпраўлены ў FIFA і AFC. Гульцы падзяліліся, што ў AFF мае месца незаконнае прысваеньне сродкаў ад FIFA, якія павінны быць накіраваны на развіцьцё футбола ў Афганістане. Футбалісты заяўляюць, што хочуць перамен і развіцьця футбола ў іх краіне, заклікаюць да спыненьня фінансаваньня з боку FIFA. AFF гэтыя абвінавачваньні абвяргаюць.

Тысячы фанат_ак Everton FC выйшлі на марш перад пачаткам матчу з Manchester City FC у знак пратэсту супраць рашэньня пазбавіць іх каманду 10 ачкоў за парушэньне правілаў лігі аб прыбытку і ўстойлівым развіцьці.

Удзельніцы маршу трымалі ў руках ружовыя карткі з лагатыпам Прэм'ер-лігі і словам «карупцыянер». Падчас матчу таксама быў выстаўлены банэр «Дзе ўлада, прагнасьць і грошы — там карупцыя».

Распавядаючы аб сваёй працы ў якасьці галоўнага трэнера футбольнага клюба Independiente, Carlos Tevez выказаўся аб важнасьці адукацыі для футбаліст_ак. Ён падзяліўся назіраньнем, што тры гульцы са складу яго каманды ня ўмеюць складаць і адымаць. Tevez лічыць, што гэтая сітуацыя склалася з-за беднасьці. «Мы можам накарміць хлопца, можам дапамагчы з многімі рэчамі, але вучоба... Яму трэба ведаць, як абараніць сябе, каб ён умеў чытаць тое, што падпісвае. Мы разам з клюбам працуем над тым, каб запрасіць выкладчыка, каб пасьля трэніроўкі яны маглі прысьвячаць пару гадзін вучобе». Прыклад ініцыятывы ў Independiente — стварэньне мадэлі, якую маглі б пераймаць іншыя клюбы, прадэманстраваўшы, што адукацыя і спорт могуць ісьці рука аб руку, спрыяючы ўсебаковаму развіцьцю людзей.

Гульцы Levante UD выйшлі на поле Ciutat de Valencia у футболках, якія сімвалізуюць мастэктамію грудзей. Пры гэтым важная ня толькі сімволіка жэсту, але і тое, што ўвесь прыбытак ад продажу такіх футболак пойдзе на падтрымку Валенсійскага аддзяленьня Гішпаньскае асацыяцыі па барацьбе з ракам малочнае залозы.

Atletico Madrid прасоўваюць праект “We Love Football”, мэта якога — «стварэньне футбола, які мы хочам бачыць, футбола, які адрозніваецца разнастайнасьцю, інклюзіўнасьцю, павагай і талерантнасьцю». Праект накіраваны на павышэньне дасведчанасьці і адукацыю моладзі, супрацоўніцтва са спартовымі арганізацыямі з мэтай пераадоленьня няроўнасьці і любых форм дыскрымінацыі, разглядаючы футбол як інструмэнт трансфармацыі грамадства.

iFlipp апублікавалі справаздачу аб індэксе кіраваньня ў эўрапейскім футболе — узроўні гендэрнага і этнічнага прадстаўніцтва на кіруючых пасадах. Мэта даследаваньня — прасачыць, наколькі палітыкі і дзеяньні, якія прымаюцца на розных узроўнях, накіраваныя на стымуляваньне гендэрнай і этнічнай разнастайнасьці, прывялі да пашырэньня разнастайнасьці ў футбольным кіраўніцтве.

# Заключэньне

Перасьлед прадстаўні_ц спартовай індустрыі Беларусі зьяўляецца прыкладам парушэньня правоў чалавека ў краіне, якое працягваецца доўгі час. Абмежаваньне свабоды СМІ праз прызнаньне незалежных медыя і журналістаў «экстрэмісцкімі» пазбаўляе спартовыя СМІ магчымасьці развіцьця, што ў сваю чаргу негатыўна ўплывае на ўсю спартовую індустрыю.

У сьвеце жаночага спорту можна назіраць пазітыўныя зьмены з пункту гледжаньня правоў чалавека: асобныя прыклады забеспячэньня роўных умоваў працы для мужчын і жанчын, будаўніцтва спецыяльных стадыёнаў, узрастаючая цікавасць да жаночых відаў спорту ў цэлым. Усё гэта — важныя этапы ў працэсе забеспячэньня справядлівых умоваў працы, інклюзіі і недыскрымінацыі. Неабходна працягваць працу на ўсіх узроўнях дзеля таго, каб новыя пакаленьні дзяўчынак і жанчын маглі рэалізоўваць максімум сваіх магчымасьцяў у сьвеце спорту.

Адсутнасьць разнастайнасьці ў футболе ва ўсім сьвеце, але асабліва ў Эўропе, — праблема, якая знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. Важна адзначыць імкненьне клюбаў, гул_інь і спартовых арганізацый да пераадоленьня гэтых бар'ераў і далейшага забеспячэньня разнастайнасьці.

Чарговая хваля інцыдэнтаў, злучаных з актыўнасьцю футбольных фанат_ак нагадвае аб неабходнасьці комплекснай працы з мэтай забеспячэньня бясьпечнага асяроддзя, каб футболам ці любым іншым відам спорту маглі атрымліваць асалоду кожн_ая бяз рызыкі гвалту ці асьцярогі за сваё жыцьцё.

Навіны па тэмах права на здароўе, правоў ЛГБТК+ супольнасьці, барацьбы з карупцыяй, войнаў і сацыяльных акцый паказвае нам ступень уплыву спорту на грамадства і правы чалавека. Заахвочваньне разнастайнасьці, інклюзіі і роўнасьці ў спорце здольна прывесьці да важных грамадскіх зьмен.

**FairPlay** — гэта праваабарончая арганізацыя ў/праз/для спорту.

**Наша місія**: пашырэньне магчымасьцяў для людзей у рэалізацыі спартовых правоў і правоў чалавека для роўнай, інклюзіўнай і справядлівай Беларусі і сьвету.

**Наша мэта**: у спартовай індустрыі паважаюцца правы чалавека.

Каб дасягнуць нашай місіі, мы:
— **Аналізуем** палітыкі, законы і практыкі і дзелімся імі зразумелай і даступнай мовай;
— Займаемся **адвакацыяй** на нацыянальным і міжнародным узроўнях;
— Займаемся **адукацыяй** і асьветай, у тым ліку праз спартовыя мерапрыемствы.

Тэкст падрыхтаваны сумесна калектывам аўтар_ак.

E-mail: sport@humanconstanta.org

Telegram | Facebook | Instagram

CC BY SA